***Савулава Л. С.***

# СУЧАСНЫ ПОГЛЯД НА НАРОДНУЮ МЕДЫЦЫНУ

***Навуковы кіраўнік: ст. выкладчык Качан А.С.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Яшчэ здаўна беларусы славіліся сваёй мудрасцю і назіральнасцю. Нашы продкі адзначалі, што сабраныя травы валодалі пэўнымі лекавымі ўласцівасцямі, пагэтаму і выкарыстоўвалі іх пры лячэнні хвароб. З цягам часу пачалі з'яўляцца знахары, якія лячылі спалох, звіх, крывацёк, апёк і іншыя захворванні. Часцей народная медыцына развівалася ў вёсках, а распаўсюджвалі яе пажылыя людзі, якія перадавалі свае веды з пакалення ў пакаленне. У кожнай мясцовасці быў свой спецыяліст, вядома, без медыцынскай адукацыі, які займаўся лячэбнай дзейнасцю. Звышмагчымымі здольнасцямі валодалі шаптухі, што ўмелі загаворваць тую ці іншую хваробу і славіліся не толькі ў роднай вёсцы, але і далёка за яе межамі. Нават і сёння немагчыма растлумачыць, якім чынам шаптухі аздараўлялі хворых і якая сіла кіравала імі.

Але час не стаіць на месцы. У XX стагоддзі ў свеце пачалася навуковая рэвалюцыя, якая закранула ўсе сферы жыцця чалавека, а асабліва хімічную прамысловасць. Развіццё біялогіі, фармацэўтыкі і інш. навук дало вялікі крок у вобласці медыцыны. Пачалі выпускацца новыя лекавыя прэпараты, вывучацца тэхналогіі і метады лячэння розных хвароб. Бясспрэчна, развіццё медыцыны важна не толькі для захавання здароўя чалавека, але і ўсёй нацыі ў цэлым.

У сувязі з працэсам урбанізацыі людзей у вёсках становіцца ўсё менш. Дзе-нідзе засталіся тыя, хто валодае пэўнымі ведамі знахарства. Вялікая колькасць хворых з надзеяй на выздараўленне і зараз звяртаецца да розных шаптух за дапамогай. Не страчвае актуальнасць такі напрамкам народнай медыцыны, як фітатэрапія. Па спадчыне перадаюцца рэцэпты на аснове траў, такіх як наготкі, чабор, рамонак лекавы, мята, бадан, шалфей, палын, сардэчнік, крываўнік, піжма, дзівасіл, настурцыя і інш. Неабходна ўлічваць, што народныя сродкі могуць дапамагчы на пачатковай стадыі захворвання, а калі хвароба набывае зацяжны характар, то народныя метады самі па сабе практычна бяссільны. Выкарыстоўваць іх можна толькі ў саставе комплекснай тэрапіі, спалучаючы з медыцынскімі прэпаратамі, назначанымі ўрачом.

Як глядзіць на ўсё гэта сучасная медыцына, якая грунтуецца на навуцы? На сучасным этапе фітатэрапія выкарыстоўваецца пры вытворчасці розных лекавых сродкаў. Шаптух медыцына не прызнае. Вельмі мала засталося тых, хто сапраўды ўмее загаворваць ад хвароб.

Такім чынам, народная медыцына мае багатую гісторыю і застаецца актуальнай ў XXI стагоддзі, а эфектыўныя кампаненты лекавых раслін знайшлі шырокае прымяненне ў фармацэўтыцы і касметалогіі.